***Я. А. Юшчанка***
*Навук. кір.* ***А. В. Брадзіхіна,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

# НЕТРАДЫЦЫЙНЫЯ ФОРМЫ РАМАНА Ў СУЧАСНАЙ ПРОЗЕ

У сучаснай беларускай літаратуры назіраюцца актыўныя эксперыметы ў галіне раманнай формы. Найбольш яскрава кірункі пошукаў сучасных празаікаў можна прадэманстраваць на прыкладзе твораў “Золата забытых магіл” Л. Рублеўскай і “Залюстрэчча для Алісы” В. Куртаніч. Першы з іх мае аўтарскі падзагаловак “паралельны раман”. З’ява паралельнасці ў творы абумоўлена наяўнасцю дзвюх сюжэтных ліній. Лінія мінулага распавядае пра лёс сям’і беларускай засцянковай шляхты Рашчынскіх. Галоўным героем з’яўляецца Вінцэсь, юнак, які становіцца кіраўніком атрада падчас паўстання К. Каліноўскага. Другая сюжэтная лінія ахоплівае нашы дні, і тут гаворка ідзе пра прыгоды выкладчыцы гісторыі, маладой жанчыны, якая адмежавалася ад свету пасля разводу з мужам. Две сюжэтныя лініі звязаны паміж сабой як праблемнымі, так і прычынна-выніковымі сувязямі, аднак характарызуюцца адноснай скончанасцю і маглі б пры жаданні аўтара стаць асобнымі творамі – адпаведна гістарычным і дэтэктыўным раманам.

“Залюстрэчча для Алісы”, паводле вызначэння В. Куртаніч, – “раман-парафраз”. Творам-першаасновай тут выступае казка Л. Кэрала “Аліса ў Залюстрэччы”, цытаты з якой служаць своеасаблівымі эпіграфамі да кожнай часткі рамана сучаснай пісьменніцы, хаця паслядоўнай сюжэтнай суаднесенасці ў тэкстах не назіраецца. Цытаты з аўтэнтычнага твора выкарыстоўваюцца з мэтай аўтаінтэрпрэтацыі або выканання сімвалічнай і прагнастычнай функцыі, але, заўсёды адсылаючы да тэксту-папярэдніка, пашыраюць кантэкст успрымання рамана. Параўноўваючы музычную і літаратурную з’яву парафраза, крытык І. Шаўлякова дае высокую ацэнку творам такога кшталту: “Аднак у кантэксце музыказнаўства парафраз(а) асэнсоўваецца як твор віртуознага характару на адну ці некалькі тэм, што аздабляюцца і вар’іруюцца” [1, с. 308].

Такім чынам, можна гаварыць пра плённасць эксперыментаў сучасных беларускіх пісьменніц у галіне буйной эпічнай формы, што выяўляюцца як на ўзроўні інтэртэкстуальнасці, так і ў структурнай арганізацыі рамана.

## Літаратура

1 Шаўлякова, І. Траекторыя блуканняў – і супраціўнага руху / І. Шаўлякова // В. Куртаніч, Залюстрэчча для Алісы : раман-парафраз, аповесці, п’еса, апавяданне. – Мінск: “Беларускі кнігазбор”, 2003. – С. 307–310.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ